УДК 94:004.738.5

# АДЛЮСТРАННЕ АБ'ЕКТАЎ ГІСТОРЫКА–КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ Ў АЙЧЫННЫХ INTERNET–РЭСУРСАХ

**_С.В. МЯНЬЧЭНЯ_**
*Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь, men_sv@tut.by*

У наш час у сувязі з працэсамі глабалізацыі, празрыстасцю межаў, хуткім і бесперапынным развіццём інфармацыйных тэхналогій, даступнасцю сусветнай культурнай спадчыны для шырокіх слаёў насельніцтва планеты (у тым ліку грамадзян Рэспублікі Беларусь) ўсё больш актуальнымі становяцца пытанні і праблемы самаідэнтыфікацыі беларусаў на аснове асэнсавання сваёй гісторыі, культуры, нацыянальных асаблівасцяў і традыцый, усведамлення свайго месца і ролі ў еўрапейскім і глабальным маштабе. Для гэтага неабходна вызначэнне перспектыў захавання і эфектыўнага выкарыстання гістарычнага, духоўнай і культурнай спадчыны беларускага народа

Гісторыка–культурная спадчына з'яўляецца ўвасабленнем вынікаў гістарычнага і культурнага развіцця народа. Вывучэнне гісторыка–культурнай спадчыны дазваляе лепш зразумець гістарычны шлях беларускага народа, дапамагае ў фарміраванні грамадзянскіх пачуццяў. З іншага боку гісторыка–культурная спадчына гэта аснова турыстычнага патэнцыяла краіны, яе візітная картка. Адной з галоўных крыніц інфармацыі сёння з'яўляецца Internet, асабліва сярод маладога пакалення, якое з'яўляецца найбольш актыўным і мабільным. Інфармацыя размешчаная на Internet–рэсурсах вызначаецца даступнасцю, аператыўнасцю ўнясення змяненняў і дапаўненняў, магчымасцю размяшчэння аўдыё– і відэаматэрыялаў, а таксама свабоднага абмеркавання. З дапамогай Internet–рэсурсаў можна даведацца аб гісторыі аб'екта, убачыць яго выяву, пракласці маршрут і наведацца аб водгуках іншых наведвальнікаў. Прадстаўленне і папулярызацыя аб'ектаў гісторыка–культурнай спадчыны праз Internet мае важнае значэнне для развіцця як унутранага так і ўязднога турызма, таму крытэрыям эфектыўнасці рэсурса з'яўляецца падтрымка некалькіх моў.

Сярод вялікай разнастайнасці сучасных Internet–рэсурсаў, прысвечаных аб'ектам гісторыка–культурнай спадчыны, можна выдзяліць наступныя групы: сайты музейных і культурных устаноў, інфармацыя аб мясцовых аб'ектах гісторыка–культурнай спадчыны на сайтах раённых і гарадскіх адміністрацый, сайты і суполкі краязнаўчых праэктаў.

На сёння пераважная большасць музейных устаноў прысутнічае ў Internet–прасторы, але ўласныя сайты з'яўляюцца з'явай не вельмі пашыранай. Прысутнасць вызначаецца інфармацыяй у музейных каталогах, на старонках мясцовых адміністрацый, наяўнасці суполак у сацыяльных сетках (Facebook, "Вконтакте" і інш.). Інфармацыя аб амаль усіх музейных установах Беларусі падаецца на старонках праэкта "Музеі Беларусі", створанага супрацоўнікамі Нацыянальнага Полацкага гісторыка–культурнага музея–запаведніка. Аўтары праэкта сабралі інфармацыю аб 152 дзяржаўных музейных установах Беларусі, прадставілі іх апісанне і спасылкі на іншыя рэсурсы. Па інфармацыі музейнага каталога на сённяшні час зусім не маюць прадстаўніцтва ў інтэрнэце пераважна дробныя ўстановы – Астравецкі гісторыка–этнаграфічны, Дзяржынскі, Пухавіцкі, Асіповіцкі, гісторыка–краязнаўчыя музеі. Гэта ж сітуацыя склалася і вакол цікавых ў плане турызма і важных для ўшанавання памяці славутых беларускіх дзеячаў аб'ектаў – музей–сядзіба А. Міцкевіча "Завоссе" (Баранавіцкі раён), музей–сядзіба Ф. Багушэвіча "Кушляны" (Смаргоньскі раён), літаратурны музей М. Гарэцкага, сядзіба–музей В. Быкава [1].

Сучасныя сайты музейных устаноў даюць магчымасць не толькі даведацца пра асноўныя экспанаты, але і віртуальна наведаць экспазіцыі музеяў. Даддзеную паслугу прадстаўляюць сусветнавядомыя музеі – Лувр, Эрмітаж. Віртуальная экскурсія носіць азнаямляльны характар і не ўплывае на колькасць рэальных наведвальнікаў музеяў, пры гэтым у патэнцыяльнага наведвальніка фарміруецца ўражанне аб музейнай калекцыі. Беларускія музейныя ўстановы звярнуліся да віртуальных экскурсій нядаўна і ў рознай ступені. Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь на сваёй старонцы знаёміць з асноўнымі артэфактамі сваіх фондаў з толькі дапамогай фотаздымкаў і тэкставай інфармацыі [2]. Музей народнай архітэктуры і побыту ў Строчыцах (Мінскі раён) дае толькі тэкставую інфармацыю без фотаздымкаў [3], якія, аднак, можна свабодна знайсці разам з апісаннем на іншых сайтах. Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь акрамя апісання фондаў прапануе віртуальныя экскурсіі па холу, экспазіцыі старажытнабеларускага мастацтва, беларускага мастацтва XIX – пачатку XX стст, беларускай экспазіцыі XX ст., рускага мастацтва



Полесгу

XVIII – пачатку XX ст., экспазіцыі еўрапейскага мастацтва і мастацтва краін Усходу [4]. Паўнавартасныя віртуальныя туры прапануюць сайты Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны [5], мемарыяльнага комплекса "Хатынь" [6], замкавага комплекса "Мір" [7], нацыянальнага гісторыка–культурнага запаведніка "Нясвіж" [8].

Што датычыцца падтрымкі розных моў, то з разгледжаных вышэй сайтаў музейных устаноў, старонка мемарыяльнага комплекса "Хатынь" мае 4 версіі (на беларускай, рускай, англійскай і нямецкай мовах) [6]. Старонкі Нацыянальнага гістарычнага і Нацыянальнага мастацкага музея, а таксама Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту падтрымліваюць беларускую, рускую і англійскую версіі [2,3,4]. Такую ж колькасць версій маюць сайты музея "Замкавы комплекс "Мір"" (пры гэтым на тытульнай старонцы інфармацыя толькі на рускай мове, у тым ліку і на кпопцы "Вход") [7] і Нацыянальнага гісторыка–культурнага запаведніка "Нясвіж". У апошнім ёсць невялікі дапаможнік наведвальніка, дзе на 12 мовах размешчана інфармацыі аб часе працы, кошце квіткоў і адрасе ўстановы [8]. Сайт мемарыяльнага комплекса "Брэстская крэпасць–герой" мае толькі рускую і англійскую версіі [9], а сайты Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны [5] і Нацыянальнага парка "Белавежская пушча" [4] працуюць толькі на рускай мове.

Для папулярызацыі гісторыка–культурнай спадчыны і развіцця турыстычнай прывабнасці рэгіёна адпаведныя раздзелы ствараюцца на сайтах раённых адміністрацый. Але узровень прэзентатыўнасці і тут адрозніваецца. Так, сайт Нясвіжскай раённай адміністрацыі ў раздзеле "Что посмотреть в Несвиже" прапануе турыстам толькі Нясвіжскі палац, касцёл Божага Цела, гарадскую ратушу і гарадскія паркі, інфармацыя аб аб'ектах размешчаных ў раёне адсутнічае [11]. Слуцкая адміністрацыя пазначае ўсе аб'екты гісторыка–культурнай спадчыны – 32, але без апісанняў і фотаздымкаў [12]. Маладзечанская адміністрацыя падае апісанне аб'ектаў спадчыны і турыстычных маршрутаў ў выглядзе асобнага тэкставага дакумента, але без фотаздымкаў [13]. Падобным чынам падаецца апісанне і гісторыка–культурных каштоўнасцей Капыльскага раёна і горада Капыля, але дадзены спіс далёка не поўны, у прыватнасці адсутнічае інфармацыя пра вёску Семежава, дзе захаваўся ўнікальны калядны звычай "Цары", які быў унесены ў спіс сусветнай спадчыны чалавецтва ЮНЭСКА [14]. У раздзеле пад назвай яшчэ аднаго аб'екта сусветнай спадчыны – "Геадэзічная дуга Струвэ" –адміністрацыя Ашмянскага раёна дае інфармацыю аб некаторых гістарычных і архітэктурных помніках, але большая частка інфармацыі прысвечана менавіта гісторыі будаўніцтва дугі Струвэ і яе пункту каля вёскі Тупішкі. Акрамя гэтага тут маецца спасылка на інфармацыю аб турыстычным патэнцыяле Аўгустоўскага канала [15]. А вось кіраўніцтва Івацэвіцкага раёна не дае інфармацыі аб знаходжанні пунктаў дугі Струвэ на сваёй тэрыторыі, увогуле пералік гісторыка–культурных каштоўнасцей выглядае тут дастаткова лаканічна:

"42 историко–культурные ценности (среди которых одна нематериальная историко–культурная ценность – обряд «Намскі Вялікдзень» в д. Оброво):

21 памятник архитектуры;

10 памятников археологии;

10 памятников истории и культуры (8 братских могил, 2 пункта дуги Струве).

145 памятников, обелисков воинской Славы, мемориальных досок, памятных знаков, воинских захоронений" [16].

Не мае візуалізацыі і пералік помнікаў гісторыі і архітэктуры гістарычнага цэнтра Пінска (27 аб'ектаў) на сайце мясцовай адміністрацыі. У раздзеле "Горад" тут размешчана некалькі фотаальбомаў, у тым ліку і старога Пінска, тых будынкаў, што не дайшлі да нашага часу (касцёл св. Станіслава і іншыя) але яны маюць подпісаў, і з папярэднім раздзелам іх звязаць складана [17].

Большасць з згаданых афіцыйных сайтаў маюць адну версію (рускамоўную), але і там, дзе ёсць англійская версія (як напрыклад сайт Капыльскай раённай адміністрацыі) падрабязная інфармацыя аб гісторыка–культурных аб'ектах адсутнічае.

Найбольш папулярным краязнаўчым праэктам ў Беларусі на сёняшні час з'яўляюцца "Падарожжы дылетанта"/"Прыгоды дылетанта" Юрыя Жыгамонта, які знаёміць гледачоў з гісторыяй беларускіх гарадоў, пасёлкаў і вёсак. На працягу 10 год праэкт ішоў на тэлеканале СТБ, у архіве якога можна знайсці старыя выпускі [18]. Пасля сыходу з тэлебачання Юрый Жыгамонт працягнуў працу над праэктам на асабістым сайце, дзе размешчаны выпускі 2016 года [19]. Першачарговая ўвага надаецца тым аб'ектам, якія знаходзяцца пад пагрозай знішчэння альбо знікнення. Праэкт мае свае суполкі ў сацыяльных сетках "Вконтакте", Facebook, дзе можна азнаёміцца з выпускамі праграмы, анонсамі новых падарожжаў, абмеркаваннямі і каментарыямі.

Шмат карыснай інфармацыі можна знайсці на старонках праэкта "Глобус Беларусі", дзе сабраны 69000 фотаздымкаў 11400 архітэктурных, археалагічных і гістарычных аб'ектаў Беларусі [20].



Полесгу

Акрамя таго на сайце маецца карта “Архітэктурная спадчына Беларусі”, ёсць мабільная версія. Праэкт дзейнічае з 2002 года, і дасланць свае фотаздымкі можа любы жадаючы. Тут ёсць варыянты турыстычных маршрутаў (“Замкавы пояс Беларусі”, “Вакол Нарачы”, “Шлях на Гродна”), якія падзелы па адлегласці і папулярнасці. Прысутнічае і невялікая бібліятэка (43 пазіцыі) з магчымасцю чытання сканіраванай версій выданняў “Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі” (1984 – 1987 гг. Да мінусаў праэкта можна аднесці адсутнасць падрабязных апісанняў аб’ектаў і адсутнасць іншых (акрамя рускай) версій.

Яшчэ адным буйным праэктам з’яўляецца “Адметнасці Беларусі, Літвы і Падляшша” [21], дзе сабраны фотаздымкі не толькі з тэрыторыі сучаснай Беларусі, але і сумежных раёнаў Літвы (Аліцкі, Віленскі і Уцянскі паветы), Польшчы (Беласток і Падляскае ваяводства) і Расіі (Бранская, Пскоўская і Смаленская вобласці). На сайце ёсць магчымасць як пошуку аб’ектаў гісторыка–культурнай спадчыны па катэгорыях так і па мясцовасці, маюцца дакладныя геаграфічныя каардынаты. Адметнасцю праэкта з’яўляецца раздзел “Страчаная спадчына”, дзе знаходзяцца фотаздымкі аб’ектаў, што не захаваліся да нашага часу, і месцаў дзе яны знаходзіліся. Праэкт падтрымлівае беларускую, рускую, польскую і англійскую версіі. Сярод мінусаў праэкта – адсутнасць тэкставай інфармацыі па некаторых помніках.

Internet–рэсурсы з’яўляюцца неад’емнай часткай сучаснай інфармацыйнай прасторы і маюць вялікі адукацыйны і выхаваўчы патэнцыял, у тым ліку пры вывучэнні аб’ектаў гісторыка–культурнай спадчыны Беларусі і арганізацыі турыстычнай дзейнасці. Internet–рэсурсы даюць магчымасць візуалізаваць працэс навучання, зрабіць больш цікавым для студэнта, што дасць вынік у выглядзе лепшага ўспрымання інфармацыі і будзе спрыяць фарміраванню тых кампетэнцый, за якія адказваюць сацыяльна–гуманітарныя дысцыпліны. З пункту гледжання развіцця турызма Internet–рэсурсы адыграваюць важную ролю ў фарміраванні іміджа краіны і яе прывабнасці для іншых грамадзян. Айчынныя Internet–рэсурсы, прысвечаныя аб’ектам гісторыка–культурнай спадчыны, у цэлым выконваюць пастаўленыя задачы, але разам з гэтым існуе шэраг праблем, такіх як узровень візуалізацыі і наяўнасць падтрымкі розных моў, што значна скарачае патэнцыяльную аўдыторыю. Але, улічваючы тэмпы развіцця Internet–прасторы і ўплыву на грамадства, можна канстатаваць, што дадзеныя недахопы будуць з цягам часу выпраўлены.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Музеі Беларусі. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://museum.by. – Дата доступу : 13.11.2016

2. Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://www.histmuseum.by. – Дата доступу : 12.11.2016.

3. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: https://etna.by/museum. – Дата доступу : 12.11.2016.

4. Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.artmuseum.by. – Дата доступу : 12.11.2016.

5. Музей истории Великой Отечественной войны. [Электронны рэсурс]. Рэжым доступа : http://www.warmuseum.by. – Дата доступа : 12.11.2016.

6. Дзяржаўны мемарыяльны комплекс «Хатынь». [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://www.khatyn.by. – Дата доступу : 12.11.2016.

7. Музей “Замкавы комплекс “Мір”” [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://mirzamak.by. – Дата доступу : 12.11.2016.

8. Нацыянальны гісторыка–культурны запаведнік “Нясвіж”. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://www.niasvizh.by. – Дата доступу : 12.11.2016.

9. Мемориальный комплекс “Брестская крепость–герой”. Официальный сайт. [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.brest–fortress.by. – Дата доступа : 12.11.2016.

10. Национальный парк “Беловежская пуща”. Официальный сайт. [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://npbp.by. – Дата доступа : 12.11.2016.

11. Что посмотреть в Несвиже? // Несвижский районный исполнительный комитет. Официальный сайт. [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://nesvizh.by/chto–posmotret–v–nesvizhe.html. – Дата доступа : 12.11.2016.

12. Историко–культурное наследие // Слуцкий районный исполнительный комитет. Официальный сайт. [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.slutsk.minsk–region.by/ru/soc/culture/ist_kult_nasledie. – Дата доступа : 12.11.2016.

13. Молодечненский районный исполнительный комитет. Официальный сайт. [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.molodechno.minsk–region.by. – Дата доступа : 12.11.2016.
14. Копыльский районный исполнительный комитет. Официальный сайт. [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://kopyl.minsk–region.by. – Дата доступа : 12.11.2016.
15. Геодезическая дуга Струве // Ошмянский районный исполнительный комитет. Официальный сайт. [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://oshmiany.gov.by/ru/47/105/333/. – Дата доступа : 12.11.2016.
16. Ивацевичский районный исполнительный комитет. Официальный сайт. [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://ivacevichi.brest–region.gov.by. – Дата доступа: 12.11.2016.
17. Пинский городской исполнительный комитет. Официальный сайт. [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.pinsk.gov.by. – Дата доступа : 12.11.2016.
18. Новыя падарожжы дылетанта // Телекомпания “Столичное телевидение”. Официальный сайт. [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.ctv.by/новыя–падарожжы–дылетанта. – Дата доступа : 12.15.2016.
19. Падарожжы дылетанта. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://www.zhygamont.by. – Дата доступу : 12.11.2016.
20. Глобус Беларуси. Архитектурные и иные достопримечательности Беларуси. [Электронны рэсурс]. – Режим доступа: http://globus.tut.by. – Дата доступа : 12.11.2016.
21. Адметнасці Беларусі, Літвы і Падляшша. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://www.radzima.org. – Дата доступу : 12.11.2016.

## REFLECTION OF HISTORICAL AND CULTURAL HERITAGE IN THE LOCAL OF INTERNET-RESOURCES

***S.V. MENCHENYA***

***Summary***

The article discusses the the place of Internet–resources devoted to objects of historical and cultural heritage, in educational work and the organization of tourist activities. The author analyzes the websites of museum institutions, local administrations and local history projects. Despite some flaws – poor visualization, lack of support for different languages – these resources are dynamically developing and generally perform their tasks.

*Статья поступила 15 октября 2016г.*

Полесгу